**В. Адамовіч**

# ВАЙНА ВАЧЫМА МАЛАДЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ ЧАСУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Другая сусветная вайна стала трагічным і жорсткім выпрабаваннем для многіх народаў свету, прынесла незлічоныя бедствы беларускаму народу, пакінула глыбокі след у памяці і душах людзей. Тэма Вялікай Айчыннай вайны, яе наступстваў, чалавека на вайне на доўгі час зойме месца ў беларускай літаратуры.

Вайна забрала вялікую колькасць жыццяў, шмат таленавітых беларускіх літаратараў загінула на яе франтах. Кожны трэці пісьменнік, які пайшоў на вайну, не вярнуўся з яе. На падзеі вайны адгукаліся не толькі ўжо вядомыя пісьменнікі і літаратары, але і зусім маладыя таленты. Сярод маладых паэтаў можна адзначыць Змітрака Астапенку, Янку Бобрыка, Леаніда Гаўрылава, Элю Кагана, Аляксея Коршака, Андрэя Ушакова і іншых, якія так і засталіся навечна маладымі.

Мікола Сурначоў – адзін з тых, хто вылучаўся сваім паэтычным талентам. Яго вершы прасякнуты тонкім лірызмам, душэўнай цеплынёй, індывідуальнасцю, пазбаўлены лозунгавасці і пафаснасці. Трагізм і драматызм у асэнсаванні вайны, свайго лёсу адчуваецца ў вершы «У стоптаным жыце». Стаптанае жыта – сімвалічны баладны вобраз. У вершы адчуваецца любоў Міколы Сурначова да жыцця, але, у той жа час, адчуваецца прадказанне свайго трагічнага лёсу, лёсу ўсяго пакалення. Але разуменне гэтага не пазбаўляе паэта ўстойлівай веры ў перамогу. Яна паўстае ў вобразе непагаснай зоркі (верш «Чырвоная зорка»), якая свяціць усім салдатам, дапамагаючы ім змагацца з ворагам. Гэты верш – гэта смутак па салдатах, але сум гэты светлы і ўзнёслы, зорачны. Паэт як бы паказвае нам, што, нават знаходзячыся ў пякельным полымі вайны, людзі бачаць надзею, старанна яе берагуць і знаходзяць у сабе сілы змагацца далей, нават калі “...будзе зорка гэта ісці па зняволенаму свету...”.

Маладыя пісьменнікі хутка рэагавалі на трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, яна мела глыбокае індывідуальнае адлюстраванне ў іх творах. Талент паэтаў не маўчаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пры гэтым іх паэзія пазбаўлена штучнай лозунгавасці і рыторыкі, насычана лірызмам, рэфлексійнасцю, чалавечнасцю, сардэчнай цеплынёй. Гэта абумоўлівае іх адметнае месца ў паэзіі ваеннага часу.

Маладыя паэты выносяць на першы план вечныя чалавечыя каштоўнасці. Вайна вачыма маладых паэтаў паўстае ў святле жорсткасці, несправядлівасці, яны паказваюць нам доблесць людзей, іх любоў да Радзімы і любоў да жыцця.

Вялікая Айчынная вайна многім талентам перашкодзіла стаць выдатнымі паэтамі, празаікамі і літаратарамі.